# МАЎЛЕНЧАЯ АКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***Вярэніч А.А., Ракавец А.В.,***
*студэнткі 1 курса БДТУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Кірдун А.А., канд. філал. навук

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь назіраецца істотны дысбаланс паміж афіцыйным статусам, высокім узроўнем развіцця сістэмы беларускай мовы (багаты слоўнікавы склад, устойлівая пісьмовая традыцыя, наяўнасць стабільных правапісных норм, развітая сістэма словаўтварэння і г. д.) і яе рэальным выкарыстаннем ва ўсіх сферах жыцця [1, с. 4]. Паказальным з'яўляецца параўнанне дадзеных двух перапісаў насельніцтва:

– у 1999 годзе беларускую мову лічылі сваёй роднай 73,6% жыхароў краіны, а ў сем'ях на ёй мелі зносіны 37%;

– у 2009 г. беларускую мову як родную абралі 53,22% жыхароў рэспублікі, дома яе выкарыстоўвалі ўжо толькі 23,43%.

Не выпадкова, што ў «Атласе моў свету, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення» ЮНЕСКА, які прызначаны для таго, каб прыцягнуць увагу ўладаў, моўных супольнасцей і шырокай публікі да праблемы моў, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення і да неабходнасці захавання сусветнай моўнай разнастайнасці, беларуская мова пазначана як vulnerable (аслабленая) [2].

У 2019 годзе з 4 па 30 кастрычніка ў Рэспубліцы Беларусь праведзены чарговы перапіс насельніцтва. Падчас гэтага перапісу рэспандэнтам былі прапанаваны наступныя пытанні:

"Да якой нацыянальнасці / этнічнай прыналежнасці вы сябе адносіце?";

"Ваша родная мова (засвоеная ў раннім дзяцінстве)?";

"Якой мовай вы звычайна карыстаецеся дома?".

Як адказалі жыхары краіны на гэтыя пытанні пакуль невядома. Дакладная інфармацыя з'явіцца толькі ў верасні 2020 года.

Мэта – вызначэння ўзроўню маўленчай актыўнасці студэнтаў на беларускай мове і стаўлення да яе.

**Матэрыял і метады.** Зацікавіўшыся праблемай функцыянавання ў нашым грамадстве беларускай мовы, якая асабіста для нас з'яўляецца роднай, мы вырашылі правесці ўласнае даследаванне шляхам анкетавання студэнтаў Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (БДТУ). На нашу думку, вывучэнне функцыянавання мовы менавіта ў моладзевым асяроддзі з'яўляецца найважнейшай задачай, неабходнай для разумення тых працэсаў, што адбываюцца на сучасным этапе ў грамадстве ў цэлым, а таксама для разумення перспектыў развіцця сацыялінгвістычнай сітуацыі ў краіне.

У нашым анкетаванні прынялі ўдзел 70 першакурснікаў розных факультэтаў БДТУ. Гэта значыць, што ўзрост рэспандэнтаў – 17–19 гадоў. Сярод іх прадстаўнікі самых розных рэгіёнаў Беларусі: мінчане; жыхары раённых гарадоў Мінскай вобласці (Барысава, Маладзечна, Нясвіжа, Салігорска, Слуцка, Вілейкі, Жодзіна, Заслаўя); жыхары Віцебска і раённых гарадоў Віцебскай вобласці (Чашнікаў, Наваполацка, Докшыц); жыхары Магілёва і раённых гарадоў Магілёўскай вобласці (Асіповічаў, Бабруйска, Касцюковічаў); жыхары Гродна і раённых гарадоў Гродненскай вобласці (Ашмянаў, Ваўкавыска, Смаргоні, Слоніма); жыхары Гомеля і раённых гарадоў Гомельскай вобласці (Калінкавічаў, Мозыра, Светлагорска, Рэчыцы); жыхары Брэста і раённых гарадоў Брэсцкай вобласці (Лунінца, Пінска, Жабінкі, Століна, Баранавічаў). Таксама сярод апытаных былі і прадстаўнікі вясковага насельніцтва (3 рэспандэнты). Такім чынам, склад удзельнікаў нашага анкетавання з'яўляецца рэпрэзентатыўным з пункту гледжання тэрытарыяльнай прыналежнасці.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Рэспандэнтам было прапанавана 12 пытанняў, у тым ліку:

"Дзе вы карыстаецеся беларускай мовай? (дома, на уроках і г. д.)"

"На якой мове вы размаўляеце часцей?"

"Якая мова з'яўляецца для вас роднай?"

"Якія адносіны ў вас да людзей, якія карыстаюцца беларускай мовай ў паўсядзённым жыцці? Адношуся станоўча/паважаю/ ўсё роўна/ іншае".

"Ці чытаеце вы літаратуру на беларускай мове? (калі так, пазначце якую)"

"Ці слухаеце вы песні на беларускай мове?"

"Ці слухаеце вы песні беларускіх выканаўцаў?"

"Якія мовы, на ваш погляд, неабходныя як дзяржаўныя?"

Адказы на гэтыя пытанні выглядаюць наступным чынам.

27 % апытаных ужываюць разам з рускай і беларускую мову, прычым не толькі на занятках ва ўніверсітэце, але і па-за яго межамі. У гэты працэнт уваходзяць і студэнты, якія пішуць вершы на беларускай мове.

Амаль усе рэспандэнты лічаць беларускую мову роднай і з павагай ставяцца да людзей, якія карыстаюцца ёй у паўсядзённым жыцці.

20% апытаных чытаюць літаратуру на беларускай мове, але пры гэтым большасць з іх пазначылі, што "толькі школьную". Ніхто не адзначыў сучаснага пісьменніка ці яго твор. Астатнія 80% далі адказ

Репозиторий ВГУ

“зусім не чытаю”. Аднак трэба адзначыць, што гэты адказ трактуецца хутчэй не як “зусім не чытаю на беларускай мове”, а як “увогуле не чытаю літаратуру”.

53% зацікаўлены творчасцю беларускіх выканаўцаў, слухаюць песні на беларускай мове, ведаюць назвы вядомых беларускамоўных гуртоў.

Наконт таго, якія мовы павінны быць дзяржаўнымі ў Рэспубліцы Беларусь, 55,7% адзначылі, што дзяржаўнай павінна быць толькі руская мова, 25,7% лічаць, што дзяржаўнымі павінны застацца руская і беларуская мовы, 18,5% чалавек лічаць, што дзяржаўнай трэба зрабіць толькі беларускую мову. Параўноўваючы гэтыя адказы з адказамі аб роднай мове, можна меркаваць, што для нашых рэспандэнтаў беларуская мова – гэта катэгорыя, “якая адлюстоўвае эмацыянальныя адносіны да мовы, этнічную арыентацыю чалавека” [3, с. 100].

**Заключэнне.** Такім чынам, наша анкетаванне паказвае, што на дадзены момант у студэнтаў сфарміравана станоўчае стаўленне да беларускай мовы. Важна, што яго можна ахарактарызаваць як канструктыўнае (гэта значыць, без дэструктыўнага патрыятызму, які, на жаль, сёння дэманструюць некаторыя носьбіты беларускай мовы ў інтэрнэт-прасторы). Аднак практычнае выкарыстанне беларускай мовы пакуль знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні, як і ў цэлым у сённяшнім грамадстве. Пытанне аб прычынах такога становішча і шляхах дасягнення руска-беларускага балансу ў краіне – гэта прадмет асобнага і складанага даследавання, але несумненным з’яўляецца адно: для таго, каб беларуская мова стала сродкам паўсядзённых зносін моладзі, неабходна прадуманая дзяржаўная палітыка па стварэнні адпаведных стымулаў.


1. Лукашанец, А.А. Беларуская мова ў XXI ст.: асаблівасці развіцця і функцыянавання / А.А. Лукашанец // Мова – Літаратура – Культура : мат-лы VI Міжнар. навук. канф., Мінск, 28–29 кастр. 2010 г. У 2 ч. Ч. 1 / Беларус. Дзярж. ун-т. – Мінск : Выд. Цэнтр БДТУ, 2011. – С. 3–8.
2. Атлас языков мира, находящихся под угрозой исчезновения [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.unesco.org/new/ru/communication-and-information/access-to-knowledge/linguistic-diversity-and-multilingualism-on-internet/atlas-of-languages-in-danger/. – Дата доступу : 07.12.2019.
3. Мікуліч, Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць / Т.М. Мікуліч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 159 с.


## ЖАНРОВАЯ СПЕЦИФИКА РОМАНА ДЖЕКА ЛОНДОНА «МАРТИН ИДЕН»


***Гаррыева Мерджен, Сулейманова Нигара,***
*студентки 2 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Гладкова А.А., канд. филол. наук, доцент


Творчество Джека Лондона давно стало классикой мировой литературы. Произведения писателя и сегодня популярны, они не утратили своей актуальности и по-прежнему вызывают интерес читательской аудитории. Роман «Мартин Иден» Джека Лондона навеян биографией самого писателя, он повествует историю самовоспитания и творческого раскрытия героя, полон размышлений о положении дел в буржуазном мире, раскрывает конфликт художника и меркантильного общества. Актуальность исследования жанровой специфики указанного романа диктуется необходимостью дополнить работы по анализу романа «Мартин Иден» с учётом современных литературоведческих концепций.

Целью работы является выявление жанровых модификаций романной формы в творчестве Джека Лондона на примере романа «Мартин Иден».

**Материал и метод.** Материалом для изучения послужил роман Джека Лондона «Мартин Иден». Для достижения поставленной цели нами использованы описательный и сравнительный методы исследования.

**Результаты и их обсуждение.** Роман «Мартин Иден» – одна из самых узнаваемых работ американского писателя Джека Лондона, в котором ярко отразились социальные проблемы времени. Также этот роман в полной мере иллюстрирует творческую зрелость Лондона как талантливого писателя-реалиста. Джек Лондон определил свою идею романа как своеобразную атаку на буржуазию и её ценности. Мы можем говорить о полемике писателя с авторами многочисленных так называемых «деловых романов», по концепции которых каждый человек якобы может стать миллионером, что и сделает его счастливым.

Говоря о жанровой специфике романа «Мартин Иден», в первую очередь отметим, что это социальный роман, так как в нём анализируется современное писателю общество. В то же время одной из ключевых в произведении является тема любви, которая дополняет социальную тематику. Черты критического реализма обусловили достоверное изображение и разоблачение ангажированной американской прессы, системы образования, буржуазной демократии и даже политики. В одном из эпизодов романа Мартин Иден, достигнув успеха, такой упрёк посылает буржуазному обществу: «Почему вы не кормили меня тогда, когда я действительно в этом нуждался? […] Вы меня угощаете вовсе не за мою работу, а потому что меня угощают все, и потому, что угощать меня теперь считается за честь» [1]. Говоря о романе «Мартин Иден» как о социальном портрете эпохи, отметим, что социальный конфликт в данном произведении дополнен идеологическим звучанием: читатель наблюдает не только столкновение разных



Репозиторий ВГУ